**Емяльянчык Б.А.,** студ. гр. 114(к) БДУКМ
Навук. кір. – Дз.П. Сергейчук, выкладчык

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ СЯМЕЙНА-БЫТАВОЙ АБРАДНАСЦІ СВЯТА МАСЛЕНКА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Сямейна - бытавая абраднасць – вялізарны пласт народнай культуры з’яўлялася неад’емнай часткай народнага быту, сямейнага ўкладу, духоўнай культуры народа, яго светапогляду, звычаёвага права, этыкі і эстэтыкі [2, с. 190].

Па меркаванні даследчыцы народнай культуры Т.І. Кухаронак: Сямейныя звычаі і абрады аб’ядноўвалі і ўмацоўвалі сям’ю, служылі своеасаблівым механізмам для перадачы спрадвечных традыцый ад продкаў да маладога пакалення. Яны дапамагалі кожнай сям’і адзначыць такія значныя падзеі, як нараджэнне дзіцяці, ўступленне маладых у шлюб, пераход сям’і ў новую хату, пахаванне. Таксама ў сямейную абраднасць уваходзяць звычаі і абрадавыя дзеянні, якія ўплывалі на ўмацаванне знешніх сувязей з сваякамі, аднавяскоўцамі. У канцы XIX – пачатку XX ст. комплекс сямейных звычаяў і абрадаў заставаўся даволі кансерватыўнай часткай народнага жыцця.

Што ж сталася з сямейна – бытавой абраднасцю нашых прабацькоў ў цяперашні перанасычаны інфармацыйнымі рэсурсамі час? Ці захавалася памяць пра старадаўнія звычаі і абрады? Якое адлюстраванне яны атрымалі ў наш час? На гэтыя пытанні мы паспрабуем адказаць ў гэтай працы, на прыкладзе сямейна - бытавой абраднасці беларускага народнага свята – “Масленка”.

Вялікае месца ў жыцці дарэвалюцыйнай сялян скай і шляхецкай сям’і займалі традыцыйныя каляндарныя святы і абрады. Іх святкаванне і выкананне мела на меце забяспечыць шчодры ўраджай, як аснову жыцця сям’і, плоднасць жывёлы, добратворна паўплываць на здароўе ўсіх членаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сям'і. Адным з найбольш цікавейшых з пункту гледжання сямейна – бытавой абраднасці свят народнага календара з'яўляецца веснавое свята – "Масленка". [2, с. 229].

Аўтары энцыклапедычнага выдання "Русский праздник" адзначаюць, што Масленіца "Увабрала ў сябе цэлы пласт рознабаковых і розначасовых традыцый, абрадавых дзеянняў і забаў. У ім перапляліся аграрныя і сямейныя абрады, язычніцкія і хрысціянскія ўяўленні аб чалавечай сутнасці і пабудове навакольнага свету".

Найбольш важнымі былі наступныя:

1. памінальныя абрады, звязаныя з памінаннем памёршых бацькоў і сваякоў, ужыванне рытуальнай ежы: бліноў, ляпёшак, аладак, пірагоў і г.д.

2. Звычаі, звязаныя з маладажонамі: агляды маладажонаў, гасцяванне ў іх свякоў.

3. Масленічныя гулянні: катанне з горак (ледзяных) і на конях, будаўніцтва снежных гарадкоў.

4. Провады Масленкі: запальванне кастроў, провады – пахаванне, масленічныя паязды, рытуальныя пераапрананні. [1, с. 74 – 75].

Гэта, калі можна так сказаць, прынцыповая схема абрадавых падзей масленічных святкаванняў. У кожны з гэтых пунктаў уваходзіць мноства абрадаў, забаў і звычаяў, у тым ліку сямейна - бытавых. Разгледзім некаторыя з тых, якія знаходзяць, ці могуць знайсці адлюстраванне ў сучасным святкаванні Масленкі.

Сапраўдны феерверк весялосці, гумару, выдумкі, народнай творчасці выплёскваўся тыды, калі жанчыны збіраліся і выконвалі комплекс абрадавых дзеянняў пад назвай: "Цягаць калодку", або проста "Калодка". Удзельнічалі ў гэтым святкаванні жанчыны ўсёй вёскі, ад самых маладых, да самых старых. Жанчыны ішлі з песнямі, крыкамі, галёканнем і цягнулі абрубак дрэва – калодку (адсюль і назва абрада). І калі гэтая шумная працэссія сустракала мужчыну, ці нежанатага хлопца – перарастка, яны накідвалі на яго вяроўку і прымушалі цягнуць калодку, ўсяляк перашкаджаючы. Каб пазбавіцца ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтай “кары”, мужчына павінен быў адкупіцца блінамі і гарэлкай, часам грашыма. [2, с. 231]. Існавалі таксама і рэгіянальныя асаблівасці выканання гэтага абраду. У некаторых мясцінах калодку вешалі на шыю, у другіх прывязвалі да нагі. Таксама існаваў варыянт, калі гурт быў хлапечы. Шумная кампанія заходзіла ў хаты, дзе былі незамужнія дзяўчыны. І ў гэтым выпадку трэба было адкупіцца. Не абдзялялі ўвагай ўдзельніцы абраду і маладых мужа і жонку, што нядаўна ўступілі ў шлюб. Жанчыны віншавалі іх, жадалі дабрабыту, нараджэння дзяцей, за што і атрымлівалі пачастункі.

Няцяжка заўважыць, як праз ўсе гэтыя абрадавыя магічныя дзеянні праходзяць дзве асноўныя ідэі: клопат аб нараджэнні роду і сімвалічная ўлада над мужчынамі, іх часовае прыніжэнне. Гэты абрад не мог не знайсці адлюстраванне ў сучасным свяце Масленка, дзе яго выкарыстоўваюць у якасці гульнёвай формы. На гульнёвай пляцоўцы свята абрад “Калодка” становіцца адным з самых зыркіх момантаў, бо выклікае вялікую колькасць жартаў, як з боку вядучага, так і з боку гледачоў. Можа быць прыменены да вялікай колькасці мужчын, дзе яны становяцца актыўнымі ўдзельнікамі дзеяння. Таксама, памятаючы пра яго першапачатковую форму, абрад “Калодка”, можа быць выкарыстаны ў тэатралізаваным шэсці, дзе да дзеяння могуць быць далучаны мужчыны – гледачы.

Яшчэ адзін цікавы масленкавы абрад, які можа быць інтэрпрытаваны і выкарыстаны ў тэатралізаваным шэсці – абрад “Паспела”. Гурт моладзі ўсаджваў на сані з белым флагам на шасце, дзяўчыну, “якой пара была ўжо выходзіць замуж” (калі нага ў яе, была таўсцейшая за руку хлопца), хадзілі па вёссцы і спявалі песню:

Чабарок, чабарок,
ды каля калiткi
Нiхто замуж не бярэ
Бо тоненькiя лыткi.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А за тым усе разам крычалі: – “Паспела! Паспела! (гэта значыць можна выдаваць замуж). Абрад меў на мэце, праз своеасаблівую рэкламу дзяўчыны, забяспечыць прадаўжэнне роду – аснову дабрабыту грамадства.

Абрад “Падначоўкі”, праіснаваў аж да 20 стагоддзя, што сведчыць аб яго запатрабаванасці ў грамадстве. Дзяўчына падыходзіла да хлопца, які ёй спадабаўся і запрашала на сенавал, дзе яны спявалі песні, і калі ён згаджауся цалаваліся ў шчочкі. Пасля, яны павінны былі ажаніцца. Хлопец не меў права гуляць з другімі дзяўчатамі, гэта каралася ў грамацтве, нават да пабояў. Уся вёска ахоўвала гэтую пару. Іншымі словамі абрад ”Падначоўкі” – гэта “нягласныя заручыны”. Абрад можа быць сцэнізаваны і выкарыстаны, ў якасці састаўной часткі праграмы, якая мае на мэце паказаць увесь вясельны комплекс ад знаёмства, да вяселля. А таксама і ў спектаклі аб народным побыце.

Яшчэ адзін зыркі эпізод святкавання масленічнай нядзелі – “Цешчын дзень”. Застаецца традыцыйным і зараз у многіх рэгіёнах Беларусі. Сама назва прысвятка гаворыць аб змесце “Цешчынага дня”. У гэты дзень прынята было прыяжджаць у госці да цешчы. Якая сустракала і частавала дарагіх гасцей – дачку і зяця, якія таксама прыяжджалі “не з пустымі рукамі”.

“Цешчын дзень”, як і вышэй названыя абрады трансфармаваўся і знайшоў адлюстраванне на сцэнічнай пляцоўцы. Сюжэт прыходу зяця да цешчы, і сходнага з ім абраду “Хаджэнне да павітух”, (калі павітуха прыходзіла да “сваіх дзетак”), добра падыйшоў да напісання сцэнарыяў тэатралізаваных прадстаўленняў і сюжэтна – гульнёвых праграмм. Шырока выкарыстоўваецца ў сучасным сваткаванні Масленкі, а значыць у яго ёсць шанс захавацца ў будучыні.

Да цяперашнега часу сістэма міжпакаленнай перадачы этнічных традыцый і сямейных абрадаў, мае праблемныя моманты. У большасці сталых людзей, ад каторых мы пераймаем традыцыі, станаўленне асобы адбывалася ў савецкія часы, часы калі пад флагам барацьбы з рэлігіяй інтэнсіўна знішчалася народная абраднасць, у тым ліку сямейная. Як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

следства гэтага, многія элементы былі страчаны, і бытуючыя зараз святочна – абрадавыя мерапрыемствы, часта ўжо не выконваюць тыя сацыяльныя функцыі, якія ў сваю чаргу з’яўляліся асновай нацыянальнага выхавання новага пакалення.

Інтэрпрэтуючы маслянічныя рытуалы, звычаі і абрады, ды і не толькі іх, не можна не заўважыць, што ад складанага міфічна - магічнага зместу амаль нічога не застаецца. У сутнасці арганізатары, рэжысёры і пастаноўшчыкі святочных сучасных форм перетвараюць складаны абрад у простую забаву, што не дапусціма. І для больш эфектыўнага захавання народнай традыцыі, нам, як будучым спецыялістам у сферы культуры і мастацтва патрэбна больш паглыбленна вывучаць сямейна – бытавую абраднасць, як мага дасканала прымяняць вопыт нашых продкаў у святочнай культуры Рэспублікі Беларусь.

1. Веснавыя святы : нарысы. У 2 кн. Кн.1 / А. Катовіч, Я. Крук; маст. У.У. Васюк, А.Л. Баранаў. – Мн. : Маст. літ., 2005. – 359 с.

2. Сям’я і сямейны побыт беларусаў / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Л.В. Ракава і інш. – Мн. : Навука і тэхніка, 1990. – 256 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ